Известия Гомельского государственного
университета имени Ф. Скорины, № 1 (94), 2016

УДК 811.161.3'373.2'271

Лёс: слова і канцэпт (спроба лінгвакультуралагічнага аналізу)

А.Д. Паўлавец, Д.Д. Паўлавец

Аналізуюцца асаблівасці выкарыстання канцэпту лёс у беларускай мове, яго роля ў нацыянальнай моўнай карціне свету, паказваецца яго шматзначнасць і разнастайнасць, суадносяцца філасофскае і міфапаэтычнае ўяўленне пра лёс як адзін з галоўных канцэптаў мовы.
Ключавыя словы: кацэпт, канцэпталогія, лёс і яго семантычны аб'ём, моўная карціна свету.

The features of the use of the concept of fate in the Belarusian language, its role in the national language picture of the world are analysed. Its ambiguity and diversity are indicated. Philosophical and mythopoetic idea of destiny as one of the main concepts of the language is studied.
Keywords: concept, concept logy, fate and its semantic volume, national language picture of the world.

Апошнім часам у навуковых колах не слабне, а нарастае цікавасць да канцэпталогіі і канцэпту. Пра гэта сведчыць паток даследаванняў, прысвечаных дадзенай праблеме, якія ахопліваюць кагнітыўную лінгвістыку, псіхалінвістыку, лінгвакультуралогію, літаратуразнаўства і іншыя навукі. Гэта пацвярджае думку пра актуальнасць і навуковую значнасць акрэсленага аспекту. «Канцэпт – гэта важная інфармацыя, якая захоўваецца ў індывідуальнай або калектыўнай памяці і валодае пэўнай каштоўнасцю, гэта перажываная інфармацыя» [1, с. 128]. Таму зварот да таго або другога канцэпту прадукцыйны і павучальны. «Кожная высокаразвітая мова мае шэраг слоў, акружаных глыбокай таямніцаю: лёс, рок, выпадак (здарэнне), прадвызначэнне. Ніводная гіпотэза, ніводная навука ніколі не зможа дакрануцца да таго, што мы адчуваем, калі заглыбімся ў сэнс і гучанне гэтых слоў. Гэта – сімвалы, але не паняцці» [2, с. 273]. Звернемся да аднаго з найбольш значных і складаных канцэптаў нацыянальнай моўнай карціны свету канцэпту лёс і прааналізуем яго ў аўтарскай і народнай канцэптасферы беларускай мовы. Пры гэтым неабходна памятаць, што «ідэя лёсу патрабуе жыццёвага досведу, а не навуковага вопыту, сілы сузірання, а не калькуляцыі, глыбіні, а не розуму» [2, с. 273].

Семантычны абсяг «лёсу» даволі шыроки і шматзначны. У ягоных межах апынуліся іншыя канцэпты, злучаныя з ім і адзін з другім, дзякуючы таму, што патрапілі ў поле ягонага прыцягнення. Гэты відавочна дамінавальны канцэпт утварае шмат новых сэнсаў, выясняе і адкрывае новыя светаразуменні ў творах мастацкай літаратуры. Пры гэтым і сам канцэпт эвалюцыянуе, мяняюцца яго межы, паняццевы аб'ём, нават сэнс, які нярэдка звязаны з аўтарскім светабачаннем, лёсам лірычнага героя. Змест ментальнай субстанцыі «лёсу», «долі» прываблівае і працягвае прываблівацъ да сябе ўвагу прадстаўнікоў розных галінаў ведаў. Аднак спецыфіка суб'екта, схаванага за назвай лёс, заключаецца ў тым, што інфармацыя пра яго не верыфікаваная, сам ён шматмерны і дапускае мноства інтэрпрэтацый, не існуе ў эміпірычным досведзе як нейкая рэальнасць.

Як і ў культурах іншых народаў, канцэпт «лёс», бадай, адзін з найгалоўнейшых канцэптаў беларускай культуры. Мусім зазначыць, што названы канцэпт прыцягваў і прыцягвае ўвагу даследчыкаў розных краін і розных галін ведаў, якія разглядаюць яго з лінгвакультуралагічнага і філасофскага бакоў, вызначаюць яго месца ў нацыянальнай моўнай карціне свету. Сапраўды, лёс – гэта найгалоўнейшая катэгорыя свядомасці, пры дапамозе якой будуецца канцэптуальная карціна свету народа. Лёс маюць усе: людзі, рэчы, з'явы, падзеі. Лёс – гэта боска ўсталяваная існасць і будучыня кожнай рэчы і кожнага чалавека, аднак гэта не разумная існасць; у рэлігійным сэнсе – гэта Бог. Слоўнікавыя дэфініцыі паняцця «лёс» сведчаць пра неадназначнасць яе разумення носьбітамі мовы. Прычына схавана ў самой лексеме лёс, разуменне якой найперш абапіраецца на эміпірычны характар.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Разуменне лёсу як найвышэйшай сілы адлюстравана ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы, ў якім за лексемай лёс замацаваны наступныя значэнні: 1. Ход падзей, якія складваюцца незалежна ад волі чалавека; збег акалічнасцей. 2. Доля. 3. Развіццё чаго-н.; далейшае існаванне, будучыня [3, с. 41]. «Беларуская энцыклапедыя» ў сваю чаргу паведамляе, што «лёс, у міфалогіі, ірацыяналістычных філасофскіх сістэмах, паўсядзённым усведамленні незразумелая, недаступная розуму, загадкавая прадвызначанасць падзей і ўчынкаў…у звычайным жыцці лёс азначае долю, жыццёвы шлях, збег абставін» [4, с. 231]. Як бачна, лёс інтэрпрэтуецца тут найперш як абстрактнае паняцце, як дзеянне ірацыянальнае, неспазнанае, таямнічае, як вобраз цёмнага пачатку, затым як нейкая несвабода, вынік учынкаў чалавека, нарэшце, як жыццё, збег абставін. «Міфалагічны слоўнік» разглядае лёс як «персаніфікацыю незалежнага ад волі чалавека ходу падзей, вырашальны збег акалічнасцяў, долю…можна меркаваць, што архаічны спосаб “сляпога” выбару-кідання, цягання, вылічэння, выбірання лёсаў (жараб'ёўка) і бачанне ў гэтым працэсе грознай праявы нейкіх надпрыродных сіл спрадзіла ўяўленне пра лёс як прадвызначанасць, долю, наканаванасць» [5, с. 288–289]. Такім чынам, з прыведзенага вышэй можна канстатаваць, што лёс – гэта нешта непазбежнае, прадвызначанае, недаступнае розуму і волі чалавека, загадкавае.

Лексіколагі, не заглыбляючыся ў сэнсава-філасофскую напаўняльнасць адзінкі (ды гэта і не іх задача), выбудоўваюць сінанімічныя рады, у якіх дамінантай выступае лёс. Так, М.К. Клышка змяшчае ў гэты сінанімічны рад семы доля, жыццё, наканаванасць, наканаванне (разм.); планіда, зорка, латарэя, кон (перан.); жытка (разм.) [6, с. 166]. С.М. Шведаў у адным шэрагу з лёсам ставіць словы фартуна, фатум, боская воля (царк.), доля, будучыня [7, с . 192]. На жаль, у Беларусі дагэтуль адсутнічае нацыянальны філасофскі слоўнік, таму цяжка гаварыць, што разумеюць пад лёсам айчынныя філосафы.

Такім чынам, дадзеныя тлумачальных, сінанімічных, міфалагічных слоўнікаў дазваляюць сцвярджаць, што канцэпт «лёс» асацыюецца ў свядомасці носьбітаў мовы з іншымі канцэптамі, матываванымі сіламі лёсу. Важна тое, што ў канцэпце лёс падкрэсліваецца момант прынцыповай незалежнасці волі чалавека ад яго пазіцыі ў адносінах да жыццёвых абставін і непазнавальнасці дэтэрмінавальных сіл лёсу, якія нараджаюць боязь, жах, яго наступствы. Лёс неаадольны, таму што ён успрымаецца нашымі продкамі як бязлітасны, жорсткі або спагадлівы, зайздросны.

Апісваючы канцэпт «судьба», Л.О. Чарнейка і В.А. Далінскі ўвялі паняцце гештальту абстрактнага імені, своеасаблівай маскі, якую апранае абстрактнае імя. Пад гештальтам яны падразумяваюць уяўленні носьбітаў мовы, схаваныя ў імені і раскрывальныя праз яго спалучальнасць. Падаецца, што назваць вобразы, уласцівыя моўнай свядомасці ўвогуле, – задача невырашальная, аднак у пэўным замкнёным коле мастацкіх тэкстаў іх можна вызначыць. Мастацкая свядомасць, мысленне або адкрывае новыя ўласцівасці, якія раскрываюцца праз прызму аўтарскага светапогляду, або падае новыя праекцыі ўжо вядомых. Дзякуючы нетыповай, унікальнай спалучальнасці семы лёс, раскрываюцца яе ўласцівасці, прымальныя беларускамоўнай свядомасцю як адпаведныя духу мовы. Зараз на падставе аналізу ўжывання лексемы лёс беларускімі творцамі паспрабуем паказаць, якія значэнні надаваліся яму рознымі аўтарамі і ў розныя перыяды.

Бадай, упершыню канцэпт лёс сустракаецца ў творчасці Ф. Багушэвіча, дзе ён асацыюецца з горам. Лірычны герой паэта што толькі не рабіў, каб адужаць гора, аднак з гэтага нічога не атрымалася (Склаў я гора ў тарбіну ды ў Мерыку адвёз, Думаў: тут або я згіну, або з гора будзе лёс). Стмаіўшыся, ён прыходзіць да сумнай высновы: Мусіць, Бог яго з душою разам возьме, разам даў.

У Я. Коласа лёс бывае розны, яго значэнне нярэдка ўдакладняецца, паглыбляецца пры дапамозе эпітэтаў. У адным выпадку – гэта былінка поля, кволая травінка (Людскі наш лёс – былінка поля, Пылок нязначны – наша доля); у другім – нейкая невядомасць, нявызначанасць, нешта хвалюючае, трывожнае (Міхал з Антосем воз прыбралі, Каня запрэглі, пастаялі У нейкім смутным разважанні, У настроі новым, хваляванні: Дарога, даль і лёс нязнаны Глядзяць няветла скрозь туманы). У гэтых радках межы канцэптуальнага поля лёс пашыраны за кошт паралеляў з дарогай, даллю. Дарога ж у беларускай міфалагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

традыцыі выступае медыятарам паміж сённяшнім і заўтрашнім. У трэцім – нешта пагрознае, няснае, што наганяе боязь, боская кара, дамоклаў меч. Такі эфект дасягаецца з дапамогай шэрагу эпітэтаў, якія ўзбагачаюць канцэпт аўтарскімі псіхалагічна-ацэначнымі адценнямі, асацыяцыямі, здаецца, яшчэ хвіліна і героя назаўсёды накрые бязлітасная снежная лавіна жыццёвай безвыходнасці (Яго (Міхала) цікавіць лёс уласны, Лёс пагражаючы, няясны, Зацята схованы, замкнёны, Бы кары цёмнае праклёны, Што кожны момант над табою Звісае страшнаю марою); у чацвёртым – гэта разлучнік (Мой мілы сын, мая Маруся! Нас разлучыў няўмольны лёс); у наступным – божы дар, прыродны талент народнага музыкі: (рад быў хлопчык: дар вялікі, Неспадзеўны то быў дар, А Сымону лёс музыкі Усміхаўся ў сонцы мар).

У моўнай стыхі У. Жылкі лёс мае выразнае рамантычнае аблічча: ён то бязлітасны, жорсткі кат, то халодная неміласэрная зброя (наш лёс, бы кат, з рукой забойнай, Бязлітасней рука каго? Ды ўмее вой адзін спакойна Без роспачы прыняць яго; лёс даручыў палашу, Моўчкі, даўно сцерагу); то шчаслівая будучыня, паспяховы шлях развіцця радзімы, вера ў яе адраджэнне (І веру радасна я болей, чым калі, У вялікі лёс і шлях радзімае зямлі: Асуджаны народ быліц дазнае сказ); то аб'яднальнік, ніт нацыянальна-вызвольных сіл, змагароў за лепшую долю народа (І адзін злучае лёс, Бо для роднай стараны Долі хочама без слёз); то Радзіма, якая даруе жыццё (І быў-пагодлівы, харошы! Мой край мне лёсам і жыццём, Маім распешчаным дзіцём); то таемным, загадкавым уладаром (Існасць не ўнятна праяў: Загадкай дрэмле разлог, Тайнасці лёс захаваў, Далі сцяною аблёг); то мізэрнае, жабрацкае існаванне, супрацьпастаўленае рабскаму лёсу (Ляпей жабрачы лёс… Але не лёс раба); то шчаслівае напоўненае радасці жыццё (Згадаўся думцы кволы Шэлі, Ягоны светласпеўны лёс).

У паэзіі А. Гаруна лёс – гэта зашыфраванае чалавечае ўбоства, пакора, задаволенасць мізэрнымі дабротамі (Жыве спакойна вол пад тым ярмом сваім, намуляў карк. Мазолі, скрозь мазолі! Падкінуць сена жмут – яму й таго даволі. І лёс мізэрны свой не назаве благім).

У паэзіі Л. Геніюш лёс – разлучнік, які раздзяліў беларусаў, раскідаў па свеце (Лёс раскідаў нас па ўсіх канцох, ты ж адзін грудзьмі супроць нягодаў); не толькі душа, знітаваная з роднай прыродай, а і ўсё роднае, блізкае, што праходзіць праз сэрца паэткі (Душа мая – ніт, пераплецены з лёсам зялёных палеткаў і вёсак у далінах, душа мая-кветкі і сум на пакосах, і ястраба шпоны, і ўзлёт галубіны). Побач з лёсам паэтка нярэдка ўжывае сінонім доля, якому надаецца то значэнне калыскі беларускасці (О, зямля! Сноў сялянскіх калыска, беларуская наша доля); то палыновай горычы (Айчына – адвечнае слова з глыбінь з жыццём удыхнулі ў сэрцы. Долі палын і нядолі цяплынь і вернасць падзеям да смерці); то ўрачыстая песня нашай прадзедаўскай мове (Мова дзядоў маіх, мова мая, Гімн нашай долі пакутны і ўзнёслы). У гэтых радках асноўным кампанентам выступае нацыянальны склад думання аўтаркі, нацыянальная логіка светасузірання, перажываная інфармацыя.

Для А. Куляшова лёс – гэта рака дзяцінства Бесядзь, на якую ён глядзіць праз своеасаблівыя «акуляры» і якая персаніфікуецца з вытокамі ягонай паэзіі, самой паэзіяй, клапатлівай маці (Плыву па ёй (Бесядзі)! Як хлопчыку малому – Паслаў мне лёс блакітную раку – праз цёмны акіян яна дадому Вядзе мяне, як маці, за руку) ці размежавальнік (Між намі лёс правёў размежаванне: Вы – скрыжаванне рук, я – крокаў рух).

У У. Караткевіча лёс – дарога, пакручастая, цёмная (Я [іду] лугавою дарогай, Пакручастай і цёмнай, як лёс); або пагрозлівая ноч (Ноч, як лёс, дамам пагражае. Цёмнай злівай, слатой. Тугой); або Залатая клетка (Няма ў душы маёй праклёнаў, Няма на веях цяжкіх слёз.. Заставайся ў клетцы залачонай Ты сама абрала гэты лёс). У гэтых радках У. Караткевіч, абапіраючыся на народна-паэтычныя традыцыі, нагадвае жанчыне пра тое, што жыць у залатой клетцы, мець дастатак, багацце — не мець свабоды, волі. Тут дарэчы будзе нагадаць народныя выслоўі: Лепш на волі на голай ветцы, чым у няволі ў залатой клетцы. Лепш на свабодзе ў каморцы, чым у няволі ў залатой клетцы. У наступных радках праз адмысловы мастацкі ракурс лёс-бізун паэт асуджае беларускую пакорнасць і адначасова выказвае сваю любоў, спагаду да свайго народа. Аўтар паглыбляе лексічнае значэнне поля лёс з дапамогай элемента семы бізун, які ў беларускім фальклоры валодае дадатковым асацыятыўным адценнем сімвала грубай сілы, прымусу (Што горды здзек, што вольнай песні ўзлёт Для чарады, чый лёс – бізун агідны. Як мне любіць такі народ?. Няшчасны мой..

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

Улюбёны.. Ненавідны); або свінец, непад'ёмны цяжар: Растаплю я твае снягі, А іначай лёс, як свінец, Сконы радасці і тугі, І канец, сапраўды канец); або Вечнасць (ты вечнасць, лёс). У мове У. Караткевіча лёс можа быць адвечны, надзвычайны, нязбыты, няўмольны, светлы, усяўладны, чорны.

У паэзіі Н. Гілевіча лёс у адным радку асацыюецца і з Беларуссю, і з вечным болем, і з недаспяванай песняй (О, Беларусь! Мой лёс, Мой вечны боль, Мая невыспеваная давеку Песня!); гэта свавольнік, гарэза (Можна ўсё да апошняй драбніцы аддаць Ды яшчэ ўсміхнуцца свавольнаму лёсу); гэта жыццёвая мярэжа (калі з гурмой дзядзькоў сівабародых, Ахрышчаны ў тваіх празрыстых водах, Ён невад тут цягнуў, нібы свой лёс); або сімвал людской абыякавасці, чалавечай трагедыі рэпрэсаваных асаднікаў (Гляджу і думаю: які нялюдскі лёс асадніцкіх сядзіб!); нарэшце, нялёгкі жыццёвы шлях (Які цяжар, якая кара, Калі, спасцігшы лёс свой трудны, Ты сам суддзя, і сам-падсудны, І сам-падсуднага ахвяра!)

М. Стральцоў спалучае лёс з міфапаэтычным вобразам дрэва, выяўляючы такім чынам універсальную канцэпцыю жыцця (Дрэва кронай хістае, нада мной навісае, як лёс); з прыроднымі з'явамі (Вада асенняе крыніцы, Яе злавесныя агні, Калі пад вечар неба ніца Глядзіць з панурай глыбіні, – Мне нагадалі даўні лёс, Якога памяць ці жывая); нарэшце паэтычная творчасць (паэзія – лёс, а лёс бывае розны, і паэт па-рознаму прымае і нясе гэты лёс).

Нечаканую алюзію канцэпт набывае ў Я. Янішчыц, якая, размаўляючы са сваёй каляжанкай Хр. Лялько, даводзіць: А востры серп прабабкі, Хрысціна, гэта – лёс. Вядома, што ў беларускай міфалогіі серп сімвалізаваў «працяг» жняі, увасабляў яе жыццёвую сілу. У іншых радках – гэта чаканне (Пад купалам нябёс, Дзе голас, як літанне, Такі нам выпаў лёс: Суцэльнае чаканне); і нечакана з'яўляеца лёс – думнік, мысляр (Вось думнік-лёс, а скраю – леснічоўка І над парожкам зарыва рабін).

Інакшае ўяўленне пра лёс, яго канцэптуальнае разуменне ў творчасці паэтаў-эмігрантаў, вымушаных уцекачоў з роднай Беларусі. Мяняюцца яго межы, паняццевы аб'ём, сэнс, які непасрэдна звязаны з выгнанніцкім лёсам. Для Алеся Змагара – гэта бязлітасны руйнавальнік (О, дзікі лёс вайны! Знішчальнік ніў, загонаў! Спыні свой страшны шал!)

У Я. Золака канцэпт лёс – выгнаннік, бесхацінец, у якім адчуваецца цяжкі псіхалагічны настрой, непрыкаянасць, бяздомнасць (З краю роднага, з роднага дому, У чужы і няведамы край Мяне выгнаў мой лёс-пустадомак Сумаваць і павольна ўміраць). Тут паэт выказаў самыя запаветныя думкі кожнага чалавека, які апынуўся на чужыне: адарванасць ад Радзімы, беспрытульнасць. Для А. Салаўя – прадвеснік смерці (Давядзецца мне долу зваліцца, патрабуе пагібелі лёс). Для М. Сяднёва – хлус, манюка (Таго ўсяго няма – лёс нахлусіў паганы).

У творчасці асобных аўтараў канцэпт лёс персаніфікуецца з конам, радзей рокам. Кон у беларускай міфалогіі – увасабленне прадвызначанага вышэйшымі сакральнымі сіламі сусветнага парадку, у больш вузкім сэнсе – лёс чалавека, яго доля [5, с. 251]. Рок – Бог праўды, справядлівасці прадвечны Кон [5, с. 238]. Паводле В. Ластоўскага, Правечны Кон – гэта другая асоба славянскай Тройцы: «Ён даў усяму жывому законы жыцця, назначыў кон, долю і акрэсліў канец, скон. <> Правечны Кон даў права, закон людзям, звярам, птахам, полазам, рыбам, і наагул усяму, што жыве, родзіцца і памірае. Устаноўленыя ім законы вечны і непарушны» [8, с. 60]. Сімвалам Кона было сонца (У той жа момант Кон Правечны блакіт-кнігу ў высях неба разгарнуў…І агністыя пісмёны адамкнуў).

У канцэпце Кон Н. Арсенневай адчуваюцца песемістычныя ноткі болю па страчанай Радзіме, скрозь якія прабіваюцца ноткі веры ў светлы дзень вяртання на Бацькаўшчыну: (Блакітная, далёкая Радзіма, калісь – штодзённы хлеб, а сяння – толькі сон, мы вернемся, чакай, хай хворымі, старымі, а вернемся! Так дай нам Кон!) У другім выпадку канцэпт Божы Кон – адлюстроўвае веру ў Бога, які дапаможа ўваскрасіць наш край (Чакайце ж, верце, прыйдзе Ён, Вялікі Дзень, і ў нашу хату, пашле і нам нарэшце свята дзіўны, нязнаны Божы Кон). У наступных радках паэтка, хоць і ўдзячная свайму лёсу, але скрозь словы падзякі прабіваецца пачуццё ахутанай паэтычнай смугой настальгіі, невылечнага болю па страчанай Радзіме (Я дзякую табе за ўсіх, за ўсё, мой кон, хоць мой нязвыклы ты людской падзякі).

Трагедыйнае светаадчуванне, бязлітасны збег абставінаў укладваюцца ў канцэпт кон М. Кавылём: Бацькоўскі дом пакінуў я даўно, Без жалю кон шляхі жарствою сцеле.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Калі само слова лёс у залежнасці ад кантэксту мае або станоўчую, або адмоўную, або нейтральную ацэнку, то яго сінонім рок утрымлівае толькі негатыўнае адценне. У паэзіі А. Гаруна рок – гэта прадвызначанасць, дараваная зверху, Богам, якую чалавек не здольны змяніць. Ён можа толькі быць удзячным Богу за яго і падпарадкоўвацца яго сіле на працягу ўсяго жыцця. Такім ён паўстае ў творах А. Гаруна (Пакуту Рок табе, шчасліваму, прызначыў, І ўдзячны за яе Вялікаму ты будзь. Мой сын, спачтаку мы падуладны пану Року – І ў гэта вер).

Слова рок вельмі рэдка сустракаецца ва ўзвышаным стылі, яго зусім няма ў народна-песеннай творчасці, слоўнікі літаратурнай мовы, на жаль, не фіксюць гэтую адзінку, якая ўзыходзіць да старажытнага ректи.

У беларускай культурнай свядомасці канцэпт «лёс» асацыюецца з наступнымі сэнсавымі радамі: доля, жыццё, наканаванасць, наканаванне, планіда, кон, рок, а ў індывідуальна-аўтарскай свядомасці гэтыя рады ўзбагачаюцца дадатковымі сэнсавымі адценнямі, якія пашыраюць звычныя значэнні. Гэта адбываецца таму, што «ў структуру канцэпта ўваходзіць усё тое, што і робіць яго фактам культуры – зыходная форма (этымалогія); сціснутая да асноўных прыкмет зместу гісторыя; сучасныя асацыяцыі; ацэнкі і г. д.» [9, с. 41]. Канцэпт «лёс» у розныя часы рэальны у сваіх розных модусах і іпастасях. Такім чынам, пра беларускі лёс нельга рабіць выснову толькі на падставе адной лексемы, аднаго паняцця, так як адпаведныя паняцці ў нашай мове размяркоўваюцца паміж значэннямі доля, рок, кон, наканаванне і іншымі. Лёс можа быць асабісты, балесны, бедака, варожы, высакосны, высокі, глыбінны, горкі, добры, другі, жабрачы, заняпалы, злы, зямны, крохкі, лёгкі, ліхі, мужны, мужычы, невядомы, непрыкаяны, няспраўджаны, нястомны, паганы, свой, светлы, скваплівы, Хрыстосаў, цяжкі, чалавечы, шчаслівы і г. д.

Адзначым, што сема лёс ужываецца пераважна ў літаратурнай мове. Магчыма, гэта тлумачыцца яе іншамоўным паходжаннем. Таму ў народнай мове часцей сустракаецца лексема доля, якая можа быць рознай: шчаслівай / нешчаслівай, добрай / злой, трагічнай / мілай, цяжкай / лёгкай, аднак яна не падобна да року. Горкая доля-нядоля – гэта супрацьпастаўленне адна з найгалоўнейшых апазіцый у мадэлі сусвету беларуса. У беларускім фальклоры шчаслівая доля называецца зоркай, нядоля ж – зорка злая, удзел горкі, бяздольны. Слова доля – гэта агульнаславянская адзінка, якая пацвярджаецца міфалагічнымі крыніцамі. Доля – гэта багіня шчасця, лёсу ў славянскай міфалогіі. Як сцвярджаецца: «Доля, доля-шчасце, адно з старых ўяўленняў-персаніфікацый, што міфалагічным спосабам тлумачыць прадвызначанасць чалавечага лёсу, яго разнастайнасць, шчаслівыя і нешчаслівыя яго вырашэнні. Паводле традыцыйных уяўленняў, чалавек надзяляецца доляй пры нараджэнні, прытым доляй яго надзяляе маці або найвышэйшыя сілы, якія сімвалізуе Бог» [5, с. 149]. Як бачна, тут падкрэсліваецца наканаванасць і разнастайнасць долі, яе адзінства, злучанасць з Богам.

У нашых продкаў лёсам кіравала богіня Мокаш, якая прала ніткі лёсу і, акрамя таго, апекавалася жаночым рукадзеллем. Ёй дапамагалі дзве сястры – Доля і Нядоля – нябесныя праллі, якія пралі нітку жыцця кожнага чалавека. Доля ўвасабляла шчасце, талань, Нядоля (Ліха) – гора, злыбеду. Доля – гэта тое, што дзеліцца на часткі, што чалавек атрымлівае пры нараджэнні. З часам чалавек асэнсоўвае сябе часткай / доляй цэлага. Аднак доля ў кожнага свая, таму што свет падзелены на долі, кожнаму дастаецца яго доля. Адбываецца ўплыў звонку. Доля не самстойная як кон, яна выпадае. Лексема доля ў сучасным беларускім маўленні амаль не сустракаецца ў свабодным словазлучэнні. А выкарыстоўваецца ў ідыёмах кшталту такая доля выпала, пакласці на чыю-небудзь долю.

Актуальнасць канцэпту для беларускай мовы пацвярджаецца існай сістэмай сінанімічнага раду, у якім, акрамя слова лёс, рэпрэзентаваны лексемы, тоесныя з'явам доля, жыццё, наканаванасць, наканаванне (разм.); планіда, зорка, латарэя, кон (перан.); жытка (разм.), фартуна, фатум, боская воля (царк.), доля, будучыня. Яны таксама ўключаюць у сябе паняцце непрадказальнасці, прадвызначанасці, незваротнасці, праўда, не ўсе дэфініцыі гэтага шэрагу цалкам тоесныя паміж сабой. Уяўленне пра лёс адносіцца да асноўных катэгорый нацыянальнай культуры, якія ствараюць глыбінны падмурак каштоўнасцяў, вызначаюцца чалавечым калектывам. Канцэпт лёс, рэдка прысутнічае ў міфалагічных, рэлігійных, філасофскіх і этычных сістэмах нашай культуры. Ён часцей за ўсё замяняецца тут сваямоўнай адзінкай доля. Якраз яна складае ядро нацыянальнай і індывідуальнай свядомасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Разглядаючы сінанімічны рад лексемы лёс, мы знаходзім варыятыўнасць ужываннння, якая абумоўлена стылёвай дыферэнцыяцыяй, семантычнай залежнасцю ад сітуацыі, калі адбываецца несвядомы, інтуітыўны выбар адпаведнага слова з усіх пададзеных тоесных адзінак. Аналізуючы прыведзены матэрыял, можна зрабіць выснову, што канцэпт лёсу рознавектарны, неадназначны. У ім знітаваны ключавыя ідэі беларускай культуры.

Літаратура

1. Карасик, В.И. Языковой круг: личность, концепты, дискурс / В.И. Карасик. – М. : Гнозис, 2004. – 392 с.

2. Spengler, O. Der Untergang des Abendlandes. Umrisse einer morphologie der Weltgeschichte. Gestalt und Wirklichkeit. / O. Spengler. – C.H. Beck'sche Verlagsbuch–Handlung. München, 1920. – 615 S.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / Акадэмія навук БССР, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа ; пад агульнай рэд. акадэміка АН БССР К.К. Атраховіча ; рэдкалегія : А.Я. Баханькоў, П.М. Гапановіч (рэд. тома), М. П. Лобан, М.Р. Суднік. – Мінск : Галоўная рэдакцыя Беларускай савецкай энцыклапедыі, 1979. – Т. 3. – 672 с.

4. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 1989. – Т. 9. – 560 с.

5. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч ; рэдкал. : С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мн. : Беларусь, 2004. – 592 с.

6. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. / М.К. Клышка ; пад рэд. Л.А. Антанюк. – 2-е выд., выпр.і дапоўн. – Мн. : Выш.шк., 1993. – 445 с.

7. Шведаў, С.М. Слоўнік сінонімаў беларускай мовы. / С.М. Шведаў – Мінск : Сучаснае слова, 2004. – 480 с.

8. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі ; Уклад., прадмова і каментарыі Я. Янушкевіча. – Мн. : Беларускі кнігазбор,1997. – 512 с.

9. Степанов, Ю.С. Константы. Словарь русской культуры. Опыт исследования / Ю.С. Степанов. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1997. – 824 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 04.01.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ